**Марыя Белякова**

## След, які немагчыма сцерці…

“Усё пакінуць след павінна…” Чамусьці менавіта гэтыя словы прыйшлі на розум, калі я ўжо ў каторы раз перачытваю апавяданне “На Каляды к сыну” Змітрака Бядулі. Невялікае апавяданне… Але які след пакідае ў душы чытача!

Я неаднаразова ацэньвала паводзіны і ўчынак Лаўрука, сына Тэклі, які гадаваўся ў пана. Як ён мог так абысціся са сваёй маці? Зрабіць выгляд, што не пазнае яе? Зачыніць перад старой жанчынай дзверы не толькі свайго багатага дома, але і сваёй душы? Ды яшчэ кінуць праз лёкая роднай маці, нібы жабрачке, грошы, быццам адкупныя?

Шмат пытанняў у маёй галаве… Я спрабую знайсці адказ. І кожны раз уяўляю сябе на месцы Лаўрука. Так, вы правільна зразумелі. Менавіта на месцы сына Тэклі. Я ўжо чую, як некаторыя з вас мяне асуджаюць: “Бедная Тэкля! Як яна пакутвала ў той страшны момант…” А ці задумваліся вы, паважаныя чытачы, што не менш балела сэрца і ў Лаўрука? Як ён ненавідзеў сябе тады і слаў праклёны ў свой адрас… Гэтыя думкі не пакідаюць мяне. Але сон перамагае…

*24.12.1913 год*

*З дзённіка Лаўрука*

Заўтра Каляды! Гэта свята падабаецца мне яшчэ з дзяцінства. Але чаму, не магу адказаць. Нешта цёплае, утульнае і роднае адчуваецца ў маёй душы ў гэты дзень. Я заплюшчваю вочы і бачу, як мая родная матуля абдымае мяне і шэпча: “Лаўручок, сыночак мой родненькі! Са святам!” Колькі прайшло гадоў, як я не бачыў яе? Ці жыве яна яшчэ? Мне сорамна…

*26.12.1913 год*

Я дэтальна памятаю той пракляты дзень…

Адчуванне нечага трывожнага закралася ў маёй душы яшчэ з раніцы. Я адганяю непрыемныя думкі і напамінаю сабе, што сёння свята, Каляды. Цішыню ў пакоі парушае разгублены голас лёкая: “Лаўрэнцій Кіпрыянавіч, да вас маці прыйшла …” Не ведаю чаму, але я адразу зразумеў, што гэта была яна.

Мне зноў сорамна… Я злуюся на яе. Як яна, бедная сялянка, асмелілася прыйсці да мяне, да пана. Усе ж могуць даведацца, з якой я сям’і! І тады што скажуць людзі?

Я выбягаю ў пакой. Я бачу яе, маленькую, згорбленую бабульку, якая нават сваім позіркам нагадвае жабрачку … Здаецца, што ўнутры ў

мяне ўсё гарыць. Я крычу, што не ведаю яе і іду назад у пакоі! Боль сціскае маё сэрца… Я загадваю  даць “жабрачке” грошай: “Памылілася жанчына, а сёння ж свята як ніяк!”

*27.12.1913 год*

Уся ноч як у тумане. Перад вачыма стаіць яна. “А сынок мой, а Лаўручок ты мой! Маткі сваёй не пазнаеш?!” Я пазнаў цябе, мама! Я падхопліваюся і, накідваючы на плечы вопратку, выбягаю  з маляваных сходаў на вуліцу. Адразу на вочы мне трапляюцца скамечаныя трохрублёўкі. Як я ненавіджу сябе ...!

…Кучар возіць мяне па гораду, але яе нідзе няма. Я знайду цябе,мама!

*29.12.1913 год*

*…Яна так і памерла ў сваёй хаце, трымаючы ў руках фотаздымак, адзінае, што засталося на памяць пра мяне, яе сына.*

Я прачынаюся і разумею, што гэта быў сон. Я ўгаворваю сябе заснуць – я павінна зразумець яго, сына Тэклі! Нічога не атрымоўваецца…

Думкі пра дзіўны сон не пакідаюць мяне ўвесь дзень. Я спрабую скласці свой працяг апавядання. Мне хочацца верыць, што Лаўрук зразумеў сваю памылку, спрабаваў выправіць яе, але не паспеў. На магіле маці Лаўрэнцій папрасіў прабачэння за свой учынак. Ён, ужо вядомы адвакат, успамінаў некаторыя моманты са свайго дзяцінства і прызнаваўся ў любві да свайго такога далёкага і адначасова самага роднага чалавека.

Я думаю, што на працягу ўсіх астатніх гадоў, якія былі адведзены Богам Лаўруку, ён кожны год на Каляды наведваў магілу сваёй маці. А потым за святочнай вячэрай расказваў дзецям цікавыя гісторыі са свайго дзяцінства і тлумачыў ім, чаму гэта важна не згубіць у сабе чалавека.

Мне сняцца розныя сны. Але Лаўрук ў маіх снах болей не з’яўляўся нават перад Калядамі. Я веру, што старая Тэкля пазірае з неба на свайго Лаўручка і адказвае добрай усмешкай на ўсе цёплыя словы свайго адзінага сына. Сэрца маці можа дараваць усё… А ці змог Лаўрук дараваць сабе? На гэтае пытанне я яшчэ не знайшла адказ.А як лічыце вы?

Сказаць, што апавяданне “На Каляды к сыну” Змітрака Бядулі пакінула ў маёй душы след, – гэта нічога не сказаць. Твор прымушае задумацца над сваімі адносінамі да бацькой і родных. Паказвае, як грошы, статус у грамадстве выцясняюць такія чалавечыя якасці, як

спагаду, цеплыню, любоў, чуласць. Апавяданне дапамагае зразумець, што час не стаіць на месцы. І ў самы непадыходзячы момант мы можам знайсці самае дарагое, а потым адразу гэта згубіць.

Як захаваць у сабе чалавека? Як не здрадзіць самому сабе? Як пражыць сваё жыццё так, каб не было сорамна ў першую чаргу перад сабой? І яшчэ шматлікія “як?”, адказы на якія кожны павінен адшукаць сам, чытаючы апавяданне “На Каляды к сыну” Змітрака Бядулі.

У адным я ўпэўнена дакладна: след, які мы пакідаем у жыцці іншых людзей, нічым немагчыма сцерці…